ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986
18 СНЕЖНЯ
ЧАЦВЕР
№ 34 (1520)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу — патрабаванне часу. Нумар газеты прысвечаны гэтай праблеме. Яго падрыхтавала рэдакцыя ў саставе С. Гогаль (рэдактар), К. Чапля (намеснік рэдактара), А. Сцяпанаў (адказны сакратар), С. Плыткевіч (фотакарэспандэнт), Т. Трацяк і В. Фядковіч (стылісты). У якасці спецыяльных карэспандэнтаў выступілі студэнты IV курса факультэта журналістыкі.

## РАЎНЕННЕ — НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!



*ЖЭНЮ АКАЕВУ шанцуе на сустрэчы з цікавымі людзьмі. І асабліва з людзьмі, па-сапраўднаму захопленымі хіміяй. Яшчэ ў шостым класе такі чалавек пазнаёміў Жэню з новай для яго тады навукай — хіміяй. А пасля сустрэчы на Усесаюзнай алімпіядзе са старшым навуковым супрацоўнікам НДІ ФХП Аляксандрам Міхайлавічам Звонакам зразумеў, што хімія — гэта яго справа. З першага курса захапіўся навуковай работай. І цяпер, на другім курсе, большую частку вольнага часу — ёй.*

*Жэня вучыцца выдатна, у грамадскай рабоце — актывіст, знаходзіць час на фатаграфію і шахматы.*

*В. ФЯДКОВІЧ.*
*Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.*

## ТЭЛЕТАЙП

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ · ЎЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

### Першае пасяджэнне

«Клуба цікавых сустрэч» для членаў добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць адбылося на тэму «Беларускі нацыянальны касцюм у Парыжы. Што вы пра гэта ведаеце?» Вёў пасяджэнне клуба дацэнт БТМІ М. Ф. Раманчук.

А. САЎЧЫК.

### Пераможцамі

чвэрцьфіналу конкурсу «КВЗ — БДУ-86» сталі каманды гістарычнага, фізічнага, юрыдычнага факультэтаў, ФПМ. Для далейшага высвятлення самых вясёлых, самых знаходлівых каманды сустрэнуцца ў паўфінале. Сустрэча запланавана на люты.

М. ТАРАСАВА.

### Шэкспір... у інтэрнаце

№ 2 чакаў тых, хто прыйдзе на сустрэчу з ім. У залу назбіралася шмат савецкіх і замежных студэнтаў, бо ў кожнага з іх свае адносіны да вялікага паэта ўсіх стагоддзяў і народаў. Таму на вечары гучалі санеты на трох мовах: англійскай, рускай, беларускай. І на кожнай з іх вялікі паэт застаецца геніем.

ЭФІЦІ ФІЛІЯМ,
студэнт факультэта журналістыкі.

### Пра творчасць

шчыра і цікава гутарылі са студэнтамі народны артыст СССР У. А. Этуш і паэт В. Л. Краснапольскі, якія прыйшлі на сустрэчу ва універсітэт.

Паэт Валерый Краснапольскі чытаў новыя вершы. На яго вершы напісана шмат песень. Паэт расказаў пра тое, якое месца займае ў яго творах тэма вайны.

Аб зацікаўленасці да асобы таленавітага артыста Уладзіміра Абрамавіча Этуша сведчыць вялікая колькасць запісак, якія ён атрымаў ад студэнтаў. У. А. Этуш расказаў пра свае апошнія і ранейшыя работы ў тэатры, кіно.

І. ГУКОЎСКІ.

## ПЕРАБУДОВА ВНУ: СТРАТЭГІЯ І ТАКТЫКА ПАСКАРЭННЯ

# ТРЫ ПОГЛЯДЫ НА «МОДУЛЬ»

Заўсёды здзіўляла: чаму студэнты большасці прыродазнаўчых факультэтаў універсітэта праходзяць практыку толькі з III курса. Што гэта? Нізкі ўзровень студэнцкіх ведаў ці звычайная перастрахоўка — студэнты ўсё ж, па маладосці, нявопытнасці і «дроў наламаць могуць». З узроўнем ведаў усё аказалася ў парадку. Напрыклад, ужо студэнты І і II курсаў «тэарэтычна» могуць выконваць некаторыя вытворчыя аперацыі сярэдняй цяжкасці. Але, на жаль, толькі «тэарэтычна», бо практычныя і лабараторныя заняткі не дазваляюць ім у поўнай меры, як след навучыцца той ці іншай рабоце.

ВОСЬ І ВЫРАШЫЛІ на факультэце радыёфізікі стварыць спецыяльны атрад — круглагадовы навукова-даследчы, пад назвай «Модуль». «Ну і што? — скажаце вы. — Хіба нейкі там атрад зможа рашыць такое складанае пытанне, як практычнае навучанне студэнтаў? Наўрад!» Наўрад? А ўсё ж...

**ДАВЕДКА.** У Беларусі аналагічных атрадаў не шмат. Але яны добра зарэкамендавалі сябе. Адным з першых такіх з'яўляецца атрад «Інтэграл» на фізічным факультэце. Ён ужо каля года працуе на вытворчым аб'яднанні «Інтэграл». Па прыкладу фізічнага факультэта радыёфізікі і вырашылі стварыць свой «Модуль». Дарэчы, такія атрады ствараюцца і на іншых факультэтах універсітэта. Мяркуецца, што яны складуць універсітэцкі КСНДА.

Усё пачалося з таго, што вытворчае аб'яднанне «Інтэграл» (на якім знаходзіцца філіял кафедры фізічнай электронікі радыёфізічнага факультэта) перайшло на трохзменную працу, з'явіліся «свабодныя» працоўныя месцы. Адміністрацыя «Інтэграла» прапанавала іх студэнтам. Факультэт прыняў прапанову. У выніку з'явіўся «Модуль». Паглядзім на факт стварэння атрада з пунктаў гледжання зацікаўленых людзей: выкладчыкаў, студэнтаў і супрацоўнікаў прадпрыемства.

**ПОГЛЯД ПЕРШЫ, ФАКУЛЬТЭЦКІ.**

Загадчык кафедры фізічнай электронікі А. А. Лабуда:

— Стварэнне атрада — рэч неабходная. Студэнт на справе адчуў усе «за» і «супраць» сваёй будучай прафесіі. Вядома, узрасце яго вопыт. Адпрацаваўшы год на прадпрыемстве, студэнт стане ў нейкім сэнсе прафесіяналам.

Члены атрада (134 чалавекі) — студэнты розных курсаў. Іх размеркаванне адбываецца з улікам спецыялізацыі, ведаў, індывідуальных здольнасцей. Студэнты будуць працаваць у другую і трэцюю змены, па 4 гадзіны. Рабочы час на «Інтэграле» не супадае з часам асноўных тэарэтычных заняткаў на факультэце. Кантраляваць і накіроўваць іх работу — справа начальнікаў і майстроў цэхаў. Усе студэнты перад тым, як прыступіць да работы, пройдуць курс тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі ў аддзеле тэхнічнага навучання на прадпрыемстве.

У. Я. Багамазаў, выкладчык кафедры:

— Студэнты, якія працуюць на «Інтэграле», атрымліваюць заработную плату як паўнапраўныя члены калектыву. Толькі працаваць ім значна лягчэй, бо норма выпрацоўкі для студэнтаў на 20 працэнтаў ніжэй, чым для астатніх рабочых аб'яднання. Сярэдні размер заробку не ніжэй чым 100 рублёў у месяц. На аб'яднанні добра аднесліся да матэрыяльнага заахвочвання студэнтаў. Для тых, напрыклад, хто будзе працаваць у 3-ю змену, прадастаўлены месцы ў інтэрнаце, бясплатнае харчаванне. Ну, а наконт маральнага стымулявання... як будзем працаваць — так нас і прывітаюць.

Меркаванні саміх студэнтаў пачынаюцца меланхалічнай няўстойлівасцю (атрад — справа цікавая, але складаная, ці пацягнем?) і заканчваюцца цвёрдай упэўненасцю, што атрад — гэта цудоўна, што ён абавязкова будзе дзейнічаць! Яны адлюстроўваюць толькі адно: ідэя «Модуля» зацікавіла студэнтаў, і яны яе падтрымалі.

Рытарычным на факультэце радыёфізікі гучыць пытанне: ці патрэбны «Модуль»? А як адносяцца да стварэння атрада на самім прадпрыемстве, можа ўжо шкадуюць аб прапанове?

**ПОГЛЯД ДРУГІ, ВЫТВОРЧЫ.**

У кастрычніку шматтыражная газета «Интеграл» выступіла з артыкулам «Будатрад у... цэху»: «Нашы цэхі адчуваюць недахоп працоўных рук... Думаю, гэты прагал змаглі б запоўніць студэнты ВНУ, аб'яднаныя ў працоўныя атрады. Іх трэба афарміць па сумяшчэнню з чатырохгадзінным працоўным днём». Іменна па такой форме ў НДІ і КБ пры ВНУ сотні студэнтаў ужо даўно працуюць. Вядома, прадпрыемству больш выгадна прыняць на работу студэнтаў ВНУ, чым людзей з «вуліцы» — зусім некампетэнтных у справе. У гэтага пытання існуе яшчэ адзін бок.

У. Я. Багамазаў:

— Справа ў тым, што самыя здольныя студэнты ідуць на «Інтэграл» з мэтавым накіраваннем ад факультэта. Гэта значыць, што пасля вучобы ва універсітэце яны застаюцца працаваць на аб'яднанні. Выгадна? Так! Па-першае, чалавек знаёміцца са сваім будучым калектывам і «прыцірaецца» да яго ўжо цяпер, у перыяд вучобы, а не пасля, калі патрэбна рытмічная работа. Па-другое, студэнт сваёй працай прыносіць рэальную карысць прадпрыемству.

Як бачыце, аб'яднанне давярае студэнтам, упэўнена ў іх ведах, працаздольнасці і жадае хутчэй убачыць моладзь у сваіх цэхах.

**ПОГЛЯД ТРЭЦІ, АБАГУЛЬНЯЮЧЫ.**

Погляды зацікаўленых бакоў супадаюць. Ды гэта кожнаму зразумела: «Модуль» патрэбны. Але чамусьці абыходзяць гэта пытанне ў абласным штабе студэнцкіх атрадаў. (Не згаджаюцца, напрыклад, на тое, каб студэнты працавалі на прадпрыемстве яшчэ і ўлетку).

«Модуль» патрэбны не толькі як механізм, які дапамагае студэнтам «набіць» руку, а прадпрыемству атрымаць прыбытак. «Модуль» павінен аб'яднаць людзей, зрабіць так, каб звычайную групу сталі называць калектывам, дружным, сур'ёзным, адзіным. Вядома, гэта няпроста. Будуць свае праблемы, цяжкасці. Вось чаму стварэнне і работа «Модуля» патрабуе шмат энергіі, сіл, адказнасці як ад студэнтаў, так і ад выкладчыкаў радыёфізічнага факультэта.

...Першая партыя атрадаўцаў ужо прыступіла да працы. Першым заўсёды цяжэй. Пажадаем ім поспеху, упэўненасці, пажадаем ім стаць сапраўднымі прафесіяналамі.

Н. СЕЛЯЗНЕВА.

НОВАЯ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫЯ

# ПЕРШЫЯ Ў КРАІНЕ

**Складаныя электронныя прылады, здольныя на адлегласці кіраваць працэсамі вытворчасці, мноства робатаў, якія вызвалілі чалавека ад цяжкіх манатонных аперацый,— каго гэта зараз здзівіць? Хвалюе іншае. Тэхніка, якая адпавядае патрабаванням часу, ёсць, а спецыялістаў, здольных працаваць з новым абсталяваннем, не хапае.**

УЛІЧВАЮЧЫ ўзросшую патрэбнасць у высокакваліфікаваных кадрах, ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР прынялі Пастанову, якая вызначыла меры па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў для асваення новай тэхнікі і тэхналогіі.

Адным з «пастаўшчыкоў» кадраў для сучаснай вытворчасці стане механіка-матэматычны факультэт універсітэта. З другога семестра гэтага навучальнага года пачне дзейнічаць першая ў краіне новая спецыялізацыя — «матэматычная электроніка». Ужо зацверджаны індывідуальны вучэбны план, які распрацавалі сумесна з факультэтам на вытворчым аб'яднанні «Інтэграл». Аб новай спецыялізацыі наша размова з начальнікам аддзялення «Інтэграла» А. В. Раманавым.

— Аляксандр Васільевіч, хацелася б спачатку разабрацца ў тэрміне «матэматычная электроніка»: што ён азначае?

— Электроніка — не што іншае, як вытворчасць інтэгральных схем. Апошнія ўяўляюць сабой вельмі складаныя прылады. Уявіце мізэрна маленькі крышталь крэмнію памерам 10 на 10 мм, а на ім — дзесяткі тысяч транзістараў. Уся сукупнасць з'яднаных паміж сабой транзістараў і ёсць інтэгральная схема. Распрацоўваць прыладу такой складанасці ўжо немагчыма без вылічальнай тэхнікі. Патрэбны спецыяльныя апараты праектавання гэтых схем. Вось тут і прыходзіць на дапамогу матэматыка. Складаюцца канкрэтныя праграмы для праектавання на аснове матэматычных метадаў. Так нарадзіўся тэрмін — матэматычная электроніка.

— У чым значэнне новай спецыялізацыі?

— Для таго, каб распрацоўваць і прымяняць апараты праектавання інтэгральных схем, неабходны адукаваныя кадры, якія валодаюць канкрэтнымі ведамі.

Матэматычную электроніку будуць вывучаць усе студэнты 1—3 курсаў вытворчага патоку. Выпускнік спецыялізацыі — гэта не «чысты» матэматык, адарваны ад практыкі, ён знойдзе прымяненне сваім ведам у любой галіне вытворчасці. Чалавек, здольны працаваць з аўтаматыкай, неабходны ўсюды. Такіх спецыялістаў даўно чакаюць на «Інтэграле», аб'яднанні вылічальнай тэхнікі, заводзе імя У. І. Леніна ў Мінску і на іншых прадпрыемствах.

— Аляксандр Васільевіч, вось ужо дзесяць год, як дзейнічае двухбаковая сувязь: «Інтэграл» — БДУ». Якой яна будзе ва ўмовах новай спецыялізацыі?

— Зараз асноўная ўвага надаецца арганізацыі вучэбнай базы на факультэце: дапамагаем сваім падшэфным у набыцці і ўстаноўцы вылічальных машын, якія неабходны для правядзення лабараторных работ. Непасрэдны ўдзел у вучэбным працэсе прымуць вядучыя спецыялісты аб'яднання, якія час ад часу будуць ператварацца ў выкладчыкаў і чытаць асобныя курсы. Ужо зараз дзейнічае сумесны навуковы семінар «Матэматычныя праблемы мікраэлектронікі», якім кіруюць прафесар кафедры алгебры Р. І. Тышкевіч і прадстаўнік «Інтэграла» В. Я. Сцепанец. Акрамя таго, на аб'яднанні арганізоўваецца філіял кафедры матэматычнай фізікі і электронікі, закладваюцца асновы для сумеснай навуковай дзейнасці. Хутка зробіць першыя крокі студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя, задача якой — выкананне канкрэтных заказаў вытворчасці.

Вельмі добра, што на факультэце існуе школа «юных». У ёй аб'яднана каля 70 вучняў 9—10 класаў. Гэта ў асноўным тыя, хто ў недалёкім будучым прыйдзе ў студэнцкую аўдыторыю, а потым і да нас — на «Інтэграл». Абедзвюма рукамі галасую за такія школы пры ВНУ, бо выяўленне і падрыхтоўка таленавітай моладзі — наша агульная мэта.

Інтэрв'ю правяла Н. ПУЗІК.

**Вось ужо амаль год прайшоў з таго часу, калі з трыбуны з'езда прагучалі словы: «Як не можа быць жывога лесу без падлеску, так і сапраўдны вучоны не ўяўляе сябе без вучняў». Вобразна сказана, і галоўнае — дакладна. Размова ішла пра будучае нашай навукі, а значыць, і нашай краіны. Звяртаючы сваю ўвагу на мінулае, аналізуючы дасягнутае, з'езд ставіў задачы на перспектыву.**

# МАЛАДОМУ ЛЕСУ ЗЕЛЯНЕЦЬ



ЯК ВЫХАВАЦЬ творчых спецыялістаў, сапраўдных вучоных? Гэта пытанне ставіцца зараз асабліва востра. Зрабіць усё для таго, каб студэнцкая аўдыторыя стала сапраўды першаасновай будучага храма навукі — галоўная задача, на якую нацэльвае нас сёння партыя. І гэта дае магчымасць не задавальняцца, не спыняцца на дасягнутым, а ісці наперад, правільна арыентавацца ў суадносінах з патрабаваннямі часу.

Лічу, што маю думку не стануць аспрэчваць зараз супрацоўнікі Навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем.

Вялікая навуковая, а ў перспектыве і практычная аддача даследаванняў, і наяўнасць высокакваліфікаваных навуковых супрацоўнікаў з'явіліся асновай для арганізацыі ў 1978 годзе на базе двух навукова-даследчых лабараторый хімічнага факультэта навукова-даследчага інстытута хімічнага профілю.

## З КЛОПАТАМ ПРА ПАПАЎНЕННЕ

Зараз у інстытуце працуе каля трохсот чалавек. Большая частка з іх — выпускнікі хімічнага факультэта. Важным дасягненнем з'яўляецца тое, што факультэт і НДІ змаглі за параўнальна кароткі час знайсці эфектыўныя формы супрацоўніцтва. Сёння НДІ і хімфак — гэта вучэбна-навуковае аб'яднанне не толькі юрыдычна, але і па сутнасці, у якім дакладна вызначаны характар узаемаадносін паміж кіраўніцтвам інстытута і яго лабараторый з аднаго боку, і кіраўніцтвам факультэта і кафедр — з другога.

...Жыхары і госці беларускай сталіцы, наведаўшы Выстаўку дасягненняў народнай гаспадаркі рэспублікі, убачаць там маляўніча аформлены стэнд «Прымяненне маласярэбраных фотаматэрыялаў у картаграфіі». За скупымі радкамі подпісу, які сведчыць пра тое, што стварэнне новага тыпу фотаматэрыялаў належыць супрацоўнікам НДІ ФХП,— шматгадовая крапатлівая праца вучоных і студэнтаў адной з лабараторый.

Так, сувязь з хімічным факультэтам падтрымліваецца моцная. Лабараторыя ж выдзелілася ў свой час з кафедры неарганічнай хіміі. Толькі вось непакоіць супрацоўнікаў, што студэнты зараз, спасылаючыся на занятасць, перагрузку, усё радзей сталі заглядваць у лабараторыю. А вось для тых, хто займаўся тут раней, лабараторыя хіміі фотапрацэсаў стала месцам пастаяннай работы. І Вольга Сяргеева, якая працуе ў НДІ ужо тры гады, і Уладзімір Белянкоў, які толькі год назад скончыў хімфак, не шкадуюць, што па размеркаванню трапілі іменна сюды.

Нядаўнія выпускнікі хімфака Міхаіл Арцём'еў, Георгій Корзун, Уладзімір Гурын — супрацоўнікі лабараторыі фотапрацэсаў займаюцца сёння навуковымі даследаваннямі, пытаннямі ўкаранення іх у вытворчасць і усе ўжо маюць тэмы будучых дысертацый. Кінутае некалі ў спрыяльную глебу зерне расце, набірае сілы.

І. САНДРОС.

НА ЗДЫМКУ: супрацоўнікі НДІ фізіка-хімічных праблем Вольга Сяргеева, Георгій Корзун, Уладзімір Белянкоў у лабараторыі хіміі фотапрацэсаў.

**Як сцвярджае статыстыка, у вышэйшых навучальных установах — каля паловы навуковага патэнцыялу краіны. Таму магчымасці ВНУ у развіцці навукі, удасканаленні тэхнікі і выхаванні спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі — вялікія. А між тым, напрыклад, за гады адзінаццатай пяцігодкі знайшлі прымяненне на прадпрыемствах толькі 163 універсітэцкія вынаходніцтвы, хаця ўсяго зарэгістравана — 1076. Як растлумачыць гэтыя лічбы? Якія праблемы паўстаюць перад універсітэцкай навукай сёння?**
**З гэтымі і іншымі пытаннямі мы звярнуліся да загадчыка аддзела арганізацыі і ўкаранення навукова-тэхнічных распрацовак Генадзя Міхайлавіча ШАСТАКОВА, прарэктара па навуковай рабоце Станіслава Станіслававіча ШУШКЕВІЧА, загадчыка кафедры радыяцыйнай хіміі Яўгена Пятровіча ПЯТРАЕВА.**

# БАР'ЕРЫ НА ШЛЯХУ







**«КРУГЛЫ СТОЛ» ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ»**

Г. М. ШАСТАКОЎ: Прычын маруднага ўкаранення вынікаў навуковых работ хапае. Калі прадпрыемствы ахвотна заключаюць гасдамоўленасці з ВНУ на канкрэтныя навуковыя распрацоўкі, то ўкараняць вынікі даследаванняў у іх не заўсёды атрымліваецца. Карысныя навуковыя здабыткі часта павісаюць у паветры. Бо для ўсіх прадпрыемстваў галоўнае — зрабіць план. А кожнае ўкараненне — рызыка яго зрыву. Асабліва спачатку. І збоі ў выкананні плана ніхто не даруе. Тым больш, невядома дакладна: ці будзе запланаваны эфект навінкі адпавядаць падлікам. Таму неабходна больш гібкая сістэма планавання «зверху», індывідуальны падыход да спраў кожнага прадпрыемства. Мэтазгодна, напрыклад, у пачатковы перыяд працы з новай тэхнікай лічбы плана не павялічваць, а потым, з улікам яе эфектыўнасці, даць больш напружанае заданне.

Цяпер другі бок праблемы. Дапусцім, нашы вучоныя зрабілі ў лабараторыі эксперыментальную мадэль. Прамыслоўцы бачаць выгаду ад яе выкарыстання, пасылаюць заяўкі на невялікую партыю. Але сёння спецыяльнае канструктарска-тэхналагічнае бюро універсітэта не ў стане выпускаць некалькі доследных узораў адразу. Неабходна пашырэнне плошчаў, абнаўленне тэхнікі, і разам з тым паўстае пытанне падбору кадраў.

КАР.: Значыць, трэба шукаць партнёраў на вытворчасці?

Г. Ш.: Гэта яшчэ складаней. Мы прапаноўвалі прадпрыемствам: нашы вучоныя плюс ваша база і інжынеры — давайце скааперыруемся. Не атрымліваецца. Прычыны вядомыя — напружаныя планы, праграмы. У лепшым выпадку яны возьмуць гатовы ўзор.

Перспектыву я бачу ў развіцці галіновых лабараторый пры універсітэце з дапамогай прамысловых арганізацый; пашырэнні доследнай вытворчасці з навейшым абсталяваннем зацікаўленых прадпрыемстваў, прызначанай для ўзнаўлення вынікаў навуковых распрацовак ва ўмовах, максімальна прыбліжаных да прамысловага вырабу. Добрая справа — стварэнне вучэбна-навукова-вытворчых аб'яднанняў. Вы універсітэце тры такія аб'яднанні. Студэнты «абжываюцца» на вытворчасці, чэрпаюць адтуль матэрыялы для курсавых і дыпломных работ. Для вучоных таксама карыснае супрацоўніцтва, толькі не заўсёды яно ўзаемавыгаднае. Мы зацікаўлены, каб нашы распрацоўкі выкарыстоўваліся максімальна, а, у прыватнасці на «Інтэграле», яны нярэдка прымяняюцца на тры чвэрці патэнцыяльных магчымасцей. Мы клапоцімся пра хутчэйшае ўкараненне вынікаў навуковых даследаванняў, а на прадпрыемстве тэрміны асваення адкладваюцца на некалькі гадоў.

**Інфармацыя для разважання.**

**У 1985 годзе прынята Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб шырокім распаўсюджанні новых метадаў гаспадарання і ўзмацненні іх ўздзеяння на паскарэнне НТП». У ёй занатавана, што ў мэтах павышэння адказнасці і зацікаўленасці вытворчых аб'яднанняў у асваенні новай тэхнікі з гэтага года заданні па вырабу доследных узораў і асваенню серыйнай вытворчасці асноўных відаў новай тэхнікі ўключаюцца ў план вытворчасці ў натуральным выражэнні. Вартасць работ па ўкараненню, аплачаная за кошт сродкаў адзінага фонду развіцця навукі і тэхнікі, улічваецца ў аб'ём рэалізаванай прадукцыі,**

## СНТ І ГАЛОСНАСЦЬ

Дзверы камітэта камсамола былі адчынены. За імі аб чымсьці спрачаліся, абмяркоўвалі. Ішло першае ў гэтым годзе пасяджэнне студэнцкага навуковага таварыства: падводзіліся вынікі мінулага года, нараджаліся нейкія новыя думкі. Іх было шмат, і размова таму вялася больш у будучым часе: зробім, заахвоцім, арганізуем, сустрэнемся, абмяркуем. Былі прапановы...

# За пратаколамі не схаваешся

АЛЕ СКЛАДВАЛАСЯ уражанне, што ўсе яны нейкія новыя, ніяк не звязаныя з працай СНТ мінулых гадоў. Як гэта атрымалася? Адказ на пытанне знайшоўся хутка: састаў СНТ у гэтым годзе амаль поўнасцю абнавіўся. А. Кожух, студэнт II курса, у гэтым годзе дэмабілізаваўся з радоў Савецкай Арміі і тут жа быў назначаны старшынёй СНТ. І цяпер Аляксандр — «новенькі». Ён амаль нічога не ведае, акрамя таго, што яму трэба нешта рабіць і так, каб гэта было бачна.

Мы зразумелі, што яму давядзецца будаваць сваю работу «з нуля». Чаму? Таму што былыя кіраўнікі СНТ скончылі хімфак, пайшлі працаваць па размеркаванню і... нічога пасля сябе не пакінулі. Нават памяці. Апошняя газета — орган СНТ — была выпушчана ў 1984 годзе. Ды і тая не несла ніякай цікавай інфармацыі, акрамя пераліку прыблізных тэм навуковых работ па розных кафедрах факультэта.

Архіўныя пратаколы, якія нам ветліва даў для знаёмства з работай СНТ новы сакратар камітэта камсамола Андрэй Акулік, былі датаваны 1983 і 1984 гадамі. Год 1985 выпаў з гісторыі СНТ факультэта, і таму студэнты не выпадкова не ведаюць пра дзейнасць навуковага таварыства.

Здзіўляе больш за ўсё тое, што не ведаюць не толькі тыя, хто зусім не цікавіцца навуковай працай, але і самі члены СНТ.

— Мне падабаецца займацца ў навуковым таварыстве. Імена тут вучышся самастойна працаваць.

Так сказала нам студэнтка III курса, выдатніца вучобы А. Румянцава. Словы былі правільныя і шчырыя. Хочацца сказаць пра іншае. Справа ў тым, што дзяўчына зацікаўлена толькі сваёй працай і нічога не ведае пра дзейнасць іншых. Яна не змагла адказаць ні на адно пытанне пра агульную дзейнасць СНТ. Не ведала, чым цікавяцца яе сябры, хто кіруе іх работай, чые працы былі дасланы на конкурс, чые адзначаны граматамі. А займаецца навуковай дзейнасцю Алена ўжо не першы год...

Успомніце, якога года апошні выпуск газеты СНТ? Чаму маўчаць газеты? Няма пра што пісаць? Але ж гэта не так. З пратаколаў былых пасяджэнняў мы даведаліся пра даволі плённую працу СНТ.

Пратаколы прыводзяць шмат прозвішчаў выкладчыкаў, студэнтаў — найбольш актыўных членаў навуковага таварыства, але мы іх не будзем пералічваць, як і не будзем называць тых, чые работы неаднаразова накіроўваліся на конкурсы. Усё па простай прычыне: яны ўстарэлі.

У СНТ прыйшлі новыя людзі. Хочацца верыць, што яны падтрымаюць старыя традыцыі, паставяць на належны ўзровень галоснасць работы таварыства. Бо пра СНТ павінны ведаць імена студэнты. СНТ — арганізацыя студэнцкая. Ці не так?

А. КРАГЕЛЬ,
І. КАЖЭЎНІКАВА.




## ЁСЦЬ КАНТАКТ!

Каб знайсці новую, арыгінальную думку,— разважаюць на кафедры фізікі паўправаднікоў,— дастаткова толькі ведаць мэту, мець палкае жаданне. І лічы — палавіна справы ўжо зроблена.

АГУЛЬНАВЯДОМА, што будынак без падмурка не ўзвядзеш. Патрэбна аснова, на якую будзе абапірацца канструкцыя. Тэрмін будаўнікоў прымальны і для фізікаў — без набытых ведаў немагчыма рашэнне элементарных задач. А кожная задача дапускае і новае рашэнне. Новае рашэнне задачы і ёсць вынаходніцтва, ёсць ідэя.

З першых хвілін, якія правялі мы на кафедры фізікі паўправаднікоў, адчулі атмасферу добразычлівасці, узаемаразумення, чалавечай цеплыні. І як не ўбачылі раўнадушных у адносінах да навуковых праблем, так і не сустрэлі абыякавасці да чалавечых пачуццяў. І прыходзяць таму студэнты з першых курсаў у навуковы калектыў кафедры як у своеасаблівы дом разумення і дапамогі.

На кафедры фізікі паўправаднікоў лічаць, што чым раней у студэнта прабудзіцца імкненне да самастойнай работы, тым большая гарантыя, што ён у будучым перарасце ў сапраўднага майстра вынаходніцкай справы. І таму гасцінна расчыняюцца дзверы на кафедры для першакурснікаў.

Гена Глухоўскі быў у ліку першых, хто прыйшоў на кафедру ў гэтым годзе.

Каб дапамагчы сарыентавацца студэнту, разабрацца, далі яму задачу, якая патрабуе ведання школьнага курса, але можа быць рошана нестандартным, нетрадыцыйным спосабам. І папярэдзілі, што ён гэтым самым з'яўляецца адным з распрацоўшчыкаў паўправадніковага генератара. Назіраючы за работай Глухоўскага, на кафедры заўважылі, што вынікі яе могуць скласці прадмет заяўкі на вынаходніцтва. І справа тут не толькі ва ўласных здольнасцях першакурсніка, а і ў тым, што на момант работы сціраецца, забываецца мяжа паміж вучоным і студэнтам, а толькі застаецца ідэя, апантаная ідэя карэннага змянення ва ўзроўні пазнання. Нам давялося быць сведкамі такога моманту.

Загадчык кафедры В. Ф. Стэльмах бачыць у Глухоўскім не проста студэнта, а бачыць калегу, здольнага самастойна вырашаць канкрэтную праблему. Дыялог паміж вучоным і студэнтам быў настолькі гарачым, творчым, прафесійным, што на першы погляд цяжка было вызначыць, хто ёсць хто. Праз некаторы час Вячаслаў Фаміч скажа, што такія вось сустрэчы ўзаемаўзбагачаюць, збліжаюць выкладчыкаў і студэнтаў.

І бытуе на кафедры меркаванне, што сённяшняму студэнту нельга адмовіць у кемлівасці, здольнасці бачыць арыгінальныя ідэі. А для сапраўднага імкнення заняцца рацыяналізатарскай, вынаходніцкай справай неабходна апынуцца ў патрэбны час у патрэбным месцы. І чым раней студэнт вырашыць, чым канкрэтна яму заняцца — тым больш выйграе.

Ёсць у вынаходнікаў своеасаблівая рыса. Напружаная работа выпрацавала ў іх звычку бачыць незвычайнае і усё пастаянна аналізаваць. Нават каву ўмеюць заварыць так, што любой гаспадыні застанецца толькі пазайздросціць. А прычына гэтага — бачыць у звычайным незвычайнае.

І завяршаючы гаворку пра ідэю, якая нараджаецца ў самых дапытлівых розумах, хочацца запэўніць, што кожны з нас можа стаць вынаходнікам. А для гэтага неабходна ўсяго толькі запаліць жаданне і мець грунтоўныя веды.

Хто ведае, які лёс чакае на выбраным полі дзейнасці тых юнакоў і дзяўчат, што заседжваюцца ў лабараторыях кафедры фізікі паўправаднікоў? Ламаносавы і Соф'і Пяроўскія, Ньютаны і Джоулі — слова за вамі!

І. КЕЗІК,
Т. ТРАЦЯК.

## ЎКАРАНЕННЯ?

а таксама як выкананне плана па дамоўленасцям.

Гэта значыць, што асваенне тэхнікі новага пакалення прадугледжваецца вытворчым планам. Больш таго, прадпрыемству будзе выгадна абнаўляць вытворчыя магутнасці, бо ўся праца па асваенню стане плюсам да аб'ёму рэалізаванай прадукцыі, за перавыкананне якога ідзе немалая прэмія. Такім чынам, крок насустрач прамыслоўцам зроблены. Справа за ажыццяўленнем добрых рашэнняў.

Калі лёс вынікаў навукова-даследчых распрацовак абазначаны — яны павінны абавязкова ўкараняцца і як мага больш эфектыўна, бо выконваюцца па заданню прадпрыемства, для прадпрыемства, на сродкі прадпрыемства,— то з вынаходніцтвамі, што ўзнікаюць у ходзе НДР, усё складаней. Растлумачыць некаторыя праблемы вынаходніцтва ў БДУ згадзіўся Станіслаў Станіслававіч ШУШКЕВІЧ:

— Ніводнай перашкоды для ўкаранення распрацовак, у прыватнасці на кафедры ядзернай фізікі, я не бачу. Вы, журналісты, вядома, хочаце, каб усе вынаходніцтвы абавязкова і вельмі хутка ўкараняліся. Але навошта? На жаль, многія з іх маюць толькі фармальную навізну. Гэта адна з прычын, па якой рэалізуецца ў практыцы адно з сотні.

Інфармацыя для разважання.

На сённяшні дзень у ЗША укараняецца кожнае восьмае вынаходніцтва. Завяршаецца толькі палова навукова-даследчых праектаў. Самыя перспектыўныя. Новая ініцыятыва ў арганізацыі навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх работ — «рызыкоўны капітал». Прадпрымальнікі стварылі фонд для фінансавання нават няпэўных, але шматабяцаючых інжынерных ідэй. Вынаходнікі-адзіночкі або брыгады змогуць арандаваць вытворчыя плошчы, абсталяванне, атрымаць кіраўнічыя і інжынерна-тэхнічныя кансультацыі.

КАР.: Фармальнае вынаходніцтва. Як гэта разумець?

С. Ш.: У нашым грамадстве існуюць разумныя, правільныя законы. Але ж без супярэчнасцей не абыходзіцца. Заўсёды знаходзяцца лоўкія людзі, жадаючыя атрымаць аўтарскае пасведчанне на вынаходніцтва. А тое, што іх прапанова не мае практычнага значэння і наогул малазначная — іх не хвалюе. Навізна (падкрэсліваю — фармальная) і адметны прызнак распрацоўкі даюць права на атрыманне аўтарскага пасведчання. Часам на такі шлях становяцца і аспіранты, бо пасведчанне прыроўніваецца да навуковай публікацыі. Дарэчы, я не памятаю такога, каб у нас «зрэзалі» аспіранта па прычыне неперспектыўнасці прапануемага вынаходніцтва.

КАР.: А як аналізуецца эфектыўнасць і важнасць навуковай працы? Можа патрэбна спецыяльная экспертная камісія, якая б мела права закрываць некаторыя тэмы?

С. Ш.: Камісіі патрэбны і існуюць. Але вызначыць каштоўнасць распрацовак, нават пры глыбокім аналізе, даволі цяжка. Потым паспрабуйце вучонаму даказаць, што тэма яго не важная, калі ён шчыра пераканаты ў яе неабходнасці. Большасць сапраўдных вынаходнікаў, якія прыйшлі ў навуку, каб перайначыць нешта ў нашым жыцці, даводзяць справу да канца і не чакаюць, што нехта за іх правядзе ўкараненне.

КАР.: Але, здаецца, ва універсітэце і сапраўдным вынаходнікам шмат перашкод на шляху ўкаранення. СКТБ не спраўляецца рыхтаваць тэхнічную дакументацыю на вынаходніцтвы. А без тэхнічнай дакументацыі (гэта падрабязнае апісанне кожнай дэталі з чарцяжамі і падлікамі — ладная папка) прадпрыемства не возьме новую тэхніку на ўкараненне.

С. Ш.: Калі вынаходніцтва патрэбна прадпрыемству — яно само выканае гэту работу!

КАР.: А цяпер такі прыклад: эксперыментальную кустарную мадэль вучоныя сабралі ў лабараторыі, падлічылі эканамічны эфект. Ці зможа ў такім выпадку СКТБ падрыхтаваць тэхнічную дакументацыю на асваенне ў вытворчасць або зрабіць дзесятак узораў?

С. Ш.: Такое заданне сапраўды не заўсёды пад сілу нашаму СКТБ. Але не толькі і не столькі з-за нястачы плошчаў і сродкаў. Справа ў тым, што асноўны напрамак НДР універсітэта — радыёэлектроннае прыладабудаванне. А пры праектаванні СКТБ і набыцці абсталявання зроблена нямала хібаў. Вось і атрымліваецца: абсталяванне прастойвае, а заданні кафедр не выконваюцца. На жаль, і з боку рэктарата быў паслаблены кантроль за дзейнасцю СКТБ, за падборам кадраў, за прапорцыямі аб'ёмаў вытворчасці і канструявання. Высокакваліфікаваных спецыялістаў не хапае. Фондааддача СКТБ: з 2,15 рубля на рубель выдаткаў у 1983 годзе знізілася да 0,33 рубля ў 1985.

КАР.: Якія рэальныя шляхі рашэння «праблемы СКТБ» вы бачыце зараз? Напрамкі работы?

С. Ш.: Ведаеце, што адказаў Л. М. Талстой, калі яго папрасілі коратка перадаць змест рамана «Вайна і мір»? — «Чытайце раман. Карацей, чым я зрабіў гэта там, не скажу». Галоўнае цяпер — ажыццявіць перабудову ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі. Неадкладна павінен пачаць работу навукова-тэхнічны савет (НТС) СКТБ, роля якога звялася да дарадчыка дырэкцыі па другарадных пытаннях, а ён прызначаны вырашаць самыя актуальныя праблемы перспектыўнага развіцця СКТБ.

КАР.: Пакуль што мы разглядалі пытанні універсітэцкай навукі, маючы на ўвазе самавітых вучоных. А што ж студэнцтва — яго творчы патэнцыял? Сёння на тысячу студэнтаў, прымаючых удзел у навукова-тэхнічнай творчасці, прыходзіцца адно вынаходніцтва. Сур'ёзную навуковую работу вядуць адзінкі. Як заахвоціць студэнта, як запаліць яго творчай дзейнасцю?

Сваімі разважаннямі дзеліцца Яўген Пятровіч ПЯТРАЕЎ:

— Нашы студэнты ўдзельнічаюць у гаспадарча-дагаворных работах. Але выконваюць толькі асобныя заданні, а ўвогуле змест дамоўленасці не ведаюць. Гэта значыць, працуюць усляпую. Больш карысней, як мне здаецца, была б арганізацыя творчых студэнцкіх брыгад з калектыўнай адказнасцю за правядзенне распрацоўкі ў поўным аб'ёме. Чаму гэта застаецца пакуль што толькі пажаданнем? Па-першае, існуе прадузятая думка ў адносінах да студэнтаў — не справяцца. Па-другое. У БДУ невялікая колькасць буйных дамоўленасцей, у межах якіх можна забяспечыць працай групу студэнтаў. І наогул тры чвэрці ўсіх дамоўленасцей БДУ заключаецца за межамі рэспублікі — з прадпрыемствамі Масквы, Ленінграда. А спецыялістаў мы рыхтуем для Беларусі. Значыць, і тэмы навуковых работ павінны быць у рэчышчы вытворчых праблем прадпрыемстваў рэспублікі.

КАР.: Навукова-вытворчыя атрады — гэта крок уперад да актывізацыі творчасці студэнтаў?

Я. П.: У мяне да НВА складаныя адносіны. Гэтыя атрады даюць студэнтам магчымасць паправіць сваё матэрыяльнае становішча і пазнаемiцца са спецыфікай прадпрыемства. Але асаблівай вартасці іх для студэнцкай навукі не бачу. «Інтэгралу» проста выгадна выкарыстоўваць студэнтаў у якасці дадатковай працоўнай сілы. А выхаваць сапраўднага творчага спецыяліста можна толькі ў межах буйной навукова-тэхнічнай праблемы пад кіраўніцтвам вучоных БДУ. Гэта маё шчырае перакананне.

Інтэрв'ю вялі
А. РУБЦОВА,
А. СТАДОЛЬНІК.

Апошнім часам шырокае распаўсюджанне атрымалі студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі. Яны вырашаюць навуковыя задачы як тэарэтычнага, так і практычнага парадку. Аб рабоце СНДЛ геаграфічнага факультэта наш карэспандэнт гутарыць з навуковым кіраўніком лабараторыі, дацэнтам Баніславай Адольфаўнай Манак:

# ДАСЛЕДЧЫК — СТУДЭНТ

— НЕ ВЕЛЬМІ ДАЎНО, гадоў 20 назад, сярод вучоных існавала думка, што вялікай даследчай працай мае права займацца толькі той, хто мае вопыт, стаж работы. Ва ўсякім выпадку — не студэнт. Вядома, моладзі давяралі, на яе спадзяваліся, але не да такой ступені, каб даручыць ёй работу ў маштабах краіны ці рэспублікі. Цяпер жа садружнасці «студэнт — даследаванні» дадзены шырокі прастор для дзеяння. Узяць для прыкладу нашу студэнцкую навукова-даследчую лабараторыю. Створана яна пры кафедры эканамічнай геаграфіі замежных краін.

Даследаванні студэнтаў у садружнасці з кафедрай у нас даўно перайшлі звычайныя маштабы студэнцкай практыкі. Работы лабараторыі выконваюцца сумесна з такімі вядучымі праектнымі арганізацыямі, як БелНДІ горадабудаўніцтва і БелНДІ дзяржсельбуда, а таксама з сектарам дэмаграфіі і працоўных рэсурсаў АН БССР і Дзяржкамітэта па працы. Усёй работай нашай лабараторыі кіруе адзіны цэнтр па вывучэнню праблем народанасельніцтва, які знаходзіцца ў Маскве.

— *Наколькі сур'ёзныя праблемы ставяцца перад студэнтамі, гаворыць тое, што большасць даследаванняў праводзіцца ў рэспубліцы ўпершыню. Вынікі іх выкарыстоўваюцца арганізацыямі ў рамках дамоўленасцей аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве. Якія ж тэмы распрацоўваюць студэнты?*

— За гады існавання лабараторыі — яна была створана ў 1983 годзе — нашы студэнты разам з супрацоўнікамі кафедры сабралі, прывялі ў сістэму і часткова абагульнілі першапачатковыя матэрыялы па праблемах рассялення жыхароў нашай рэспублікі, пытаннях міграцыі насельніцтва, фарміравання і выкарыстання працоўных рэсурсаў. Дарэчы, усё гэта рэальна звязвае нашы даследаванні з развіццём НТП, якія немагчымы без уліку «чалавечага фактару» і дэмаграфічных працэсаў. Нашы распрацоўкі дапамагаюць у назапашванні гэтых ведаў.

— *Мне ўспомнілася размова са студэнтамі, членамі СНДЛ. Як ні парадаксальна, але яны не лічаць свае заслугі такімі ўжо вялікімі. Для іх праца ў лабараторыі неаддзельная ад навучання. А. Мацюкевіч спытала: «А што асаблівага мы робім? Праўда, анкетаваннем займаемся, карты складаем. Але мы лічым гэта сваім абавязкам. І нічога незвычайнага». І тым не менш...*

— Распрацоўкі нашых студэнтаў знаходзяць шырокае практычнае выкарыстанне. Многія выпускнікі геафака сталі супрацоўнікамі праектных і навукова-даследчых арганізацый, аспірантамі, паспяхова працуюць у абранай галіне. Нават тыя, хто не збіраецца звязваць сваё жыццё з навукай, лічаць працу ў лабараторыі неабходным этапам прафесійнай падрыхтоўкі.

Ва ўмовах НТР патрабаванні да спецыялістаў узрастаюць. Вышэйшая школа заклікана рыхтаваць спецыялістаў шырокага профілю, якія змаглі б спалучаць тэарэтычныя веды з уменнем кваліфікавана рашаць практычныя задачы. Навукова-даследчая работа ў нашай СНДЛ — адна з умоў падрыхтоўкі такога спецыяліста.

Калектыў СНДЛ з'яўляецца крыніцай навукова-працоўнага патэнцыялу кафедры пры выкананні важнейшых народнагаспадарчых тэм. Прыклад навуковага супрацоўніцтва — лабараторыя. Праўда, назва такая вельмі ўмоўная. Гэта рабочая група даследчыкаў, якія разам з аспірантамі і выкладчыкамі кафедры працуюць над выкананнем планавых навуковых тэм.

Нашым студэнтам удалося сабраць унікальную першапачатковую інфармацыю, якая з'яўляецца дапаўненнем да афіцыйных статыстычных даных. Рабяты займаліся даследаваннямі ў час вытворчай практыкі, на працягу навучальнага года пасля заняткаў. Цяпер сабраныя даныя абагульняюцца, выконваюцца складаныя разлікі з дапамогай ЭВМ, складаецца картаграфічны матэрыял.

— *Нядаўна ў рэктарат універсітэта прыйшла тэлеграма з Масквы. Цэнтр па вывучэнню праблем народанасельніцтва прасіў згоды СНДЛ «удзельнічаць у якасці саўдзельнікаў у плане важнейшых даследаванняў па грамадскіх навуках Дзяржплана СССР, ДКНТ і АН СССР па тэме «Сацыяльна-эканамічныя праблемы дэмаграфічнай палітыкі СССР: мэты і крытэрыі якасці даследавання па краіне ў цэлым і асобных рэгіёнах». Адказ-згода кафедрай яшчэ не дадзены.*

— Але ж мы рады, што нашым студэнтам аказаны такі высокі давер. У іх мы, выкладчыкі, бачым дастойную змену, племя маладых, дапытлівых розумаў. А. Падрэз, І. Амброз, Н. Грышкевіч, Т. Станюта — ім быць нашымі прадаўжальнікамі.

Гутарку вяла І. МАСЛЯНІЦЫНА.

## СНДЛ: ЗДАБЫТКІ І ПРАБЛЕМЫ



## НАШ ФОТАКОНКУРС

Мы крочым. З дня ў дзень. Рухаемся наперад, а разам з намі — навука, тэхніка. Растуць новыя заводы, перапыняюць магутны бег рэк гідраэлектрастанцыі, чалавек даўно ўжо прарваў дах — неба — і вырваўся на новыя прасторы. Хутчэй, хутчэй.

Чалавек, спыніся на хвіліну. Зірні наўкол, паглядзі, якая прыгажосць побач.

Той, хто зразумее, хто палюбіць яе ва ўсіх праявах, стане яшчэ багацейшым, мацнейшым, лепшым, а значыць, больш чалавечным.

Фота М. ГІЛЯ і І. БЫШНЕВА.





Відаць, любы студэнт на кожным прыродазнаўчым факультэце скажа вам, што такое СНДЛ — студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя, Прадстаўнікам грамадскіх навук складаней адказаць на гэтае пытанне. У іх існуе іншая форма работы студэнцкага навуковага таварыства — навуковы гурток. І справа не толькі ў іншай назве. Няхай не пагадзяцца з намі «гуманітарыі», але для будучага фізіка, хіміка, біёлага непарыўная сувязь з практыкай важней, чым для гісторыка або філолага. СНДЛ, у адрозненне ад навуковага гуртка, якраз дае студэнту магчымасць набыць практычныя навыкі. Дзякуючы такім лабараторыям сувязь «студэнт — вытворчасць» не абмяжоўваецца толькі часам праходжання вытворчай практыкі. Прадпрыемствы Мінска заключаюць з СНДЛ дамоўленасці, якія змяшчаюць заказы на распрацоўкі, што укараняюцца пазней у вытворчасць. Так студэнты са сваімі старэйшымі калегамі непасрэдна вырашаюць праблемы нашай народнай гаспадаркі.

# «ШУКАЕМ ТАЛЕНТЫ»

УСЕ ГЭТА мы добра ведалі, калі збіраліся пісаць пра СНДЛ ва універсітэце. Але калі нам параілі звярнуцца на кафедру ядзернай фізікі фізічнага факультэта, мы былі вельмі здзіўлены. З нашымі школьнымі ведамі амаль немагчыма было ўявіць, як праблемамі ўкаранення дасягненняў ядзернай фізікі могуць займацца ў студэнцкіх лабараторыях. Разабрацца з гэтым дапамог загадчык лабараторыі аўтаматызацыі фізічнага эксперыменту Валерый Леанідавіч Гурачэўскі.

— Наша лабараторыя працуе ўжо больш пяці гадоў. І даволі паспяхова,— расказвае Валерый Леанідавіч.— Калі гаварыць пра апошнія распрацоўкі, у якіх актыўны ўдзел прымалі студэнты, то можна адзначыць стварэнне месбаўэраўскага спектрометра на базе мікраЭВМ для вучэбных лабараторый ВНУ, якім займаўся наш нядаўні выпускнік, а сёння супрацоўнік кафедры Алег Місевіч. Зараз мы займаемся распрацоўкай сістэмы аўтаматызацыі вымярэнняў для экспрэс-аналізу саставу касітэрыту...

— ?!

— Паспрабую растлумачыць. Асноўная тэма работ нашай лабараторыі — аўтаматызацыя навуковых даследаванняў, гэта значыць апрацоўка даных эксперыменту, канкрэтных вынікаў, якія змаглі б зразумець і выкарыстоўваць у сваёй рабоце спецыялісты іншых галін. У нашым выпадку — геолагі. Гэта прылада дапамагае шукаць карысныя выкапні. Экспрэс-аналізатар распрацоўваецца па заказу Міністэрства геалогіі разам з галіновай навукова-даследчай лабараторыяй. Прылада вызначаецца, перш за ўсё, дасціпнасцю ў абыходжанні дзякуючы выкарыстанню ў ёй прынцыпова новага аўтаматызаванага блоку апрацоўкі інфармацыі. Летась я прысутнічаў як прадстаўнік лабараторыі на выпрабаваннях экспрэс-аналізатара. Геолагі адзначылі гэту прыладу. Зразумела, выпрабаванні высветлілі пэўныя недахопы. Гэта ж першы варыянт аналізатара. Работа працягваецца. Сярод студэнтаў, якія працавалі над гэтым прастасаваннем, магу вылучыць Андрэя Лапаціка. Ён у гэтым годзе скончыў універсітэт. Вынікі работы ў СНДЛ былі пакладзены ў аснову яго дыплома. Амаль усе студэнты, якія займаюцца ў лабараторыі, вызначаюць тэмы будучых дыпломных работ у нас.

Размову мы працягваем з Алегам Місевічам. Прабачце, з Алегам Валянцінавічам. Ён скончыў факультэт у мінулым годзе, а зараз — супрацоўнік лабараторыі, сам кіруе дыпломнікамі-пяцікурснікамі.

— Работа студэнта ў лабараторыі,— расказвае ён,— перш за ўсё з ЭВМ. Без аўтаматызацыі сёння немагчыма ўявіць любы эксперымент у ядзернай фізіцы. На жаль, да сённяшняга дня існуюць супрацоўнікі, якія сцвярджаюць, быццам аўтаматызацыя далёкая ад праблем ядзернай фізікі. Але ўявіце сабе: у працэсе аднаго эксперыменту даследчык можа атрымаць некалькі тысяч (!!!) рэзультатаў за адну мінуту! Без дапамогі ЭВМ іх апрацаваць не пад сілу ні аднаму чалавеку. Асаблівасці ўжывання вылічальнай тэхнікі ў ядзернай фізіцы — гэта не толькі ўменне скласці праграму, атрымаць вынікі, але і глыбокае ўсведамленне задач эксперыменту, здольнасць паглядзець на яго з пункту гледжання вучонага. Вось чаму спецыялісты вузкага радыётэхнічнага профілю не адпавядаюць запатрабаванням. А патрэбнасць у вучоных-эксперыментатарах расце. Напрыклад, яны патрэбны для нядаўна створанага НДІ ядзерных праблем.

— Такія спецыялісты — сувязное звяно паміж тэарэтыкамі і эксперыментатарамі-практыкамі,— уступае ў размову студэнт-пяцікурснік Раман Прыткоў.— Але мы, зразумела, больш імкнёмся да практычнай работы эксперыментатара. З намі непасрэдна займаюцца супрацоўнікі лабараторыі. Аб высокіх патрабаваннях да нашай працы гаворыць ужо той факт, што студэнты ў нас пачынаюць займацца з III курса. Гэта значыць, што для працы нам неабходна мець моцную тэарэтычную базу.

— Нестандартнасць такой формы арганізацыі работы студэнтаў у лабараторыі,— тлумачыць Алег Валянцінавіч,— дэмакратычнасць у зносінах. Усё гэта ў нейкай меры аванс, але і патрабаванні высокія: працаваць, працаваць і працаваць. Мы хочам выхаваць у студэнтаў імкненне да самастойнасці, а яе аснова — уменне даводзіць справу да канца. Перад імі ж ставяць канкрэтную задачу, вырашэнне якой яны павінны прапанаваць самі. І ведаеце, часам прыходзяць з такімі ідэямі, што здзіўляешся, як сам да гэтага не дадумаўся. Пакуль вучоба не стане творчым працэсам, яна малакарысная. У гэтай аксіёме мы пераканаліся не раз на практыцы. Асноўная бяда многіх студэнцкіх лабараторый — гэта недавер да магчымасцей студэнтаў, якія доўгі час вымушаны даказваць свае здольнасці самастойна мысліць і працаваць, выконваючы нязначныя, «падсобныя» работы.

Зразумела, пра якое выхаванне творчай, з арыгінальным мысленнем асобы можна гаварыць пры такім падыходзе да справы? У студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі аўтаматызацыі фізічнага эксперыменту, як мы пераканаліся, усё інакш. Давер і патрабавальнасць, імкненне прывіць студэнтам зацікаўленасць да самастойнай навуковай працы, пастаянная сувязь з апошнімі дасягненнямі навукі — гэтыя рысы вылучаюць лабараторыю сярод іншых. Думаем, што рабятам усё гэта дапаможа вырасці ў сапраўдных вучоных.

— Нам патрэбны таленты,— сказаў на развітанне Валерый Леанідавіч,— але таленты, якія перш за ўсё жадаюць працаваць.

Ж. МІХАЙЛАВА,
Т. СЯМЕНАВА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

18 снежня 1986 года

АТ 07741. Зак. 1524.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЕЎ.